ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

Год выдання другі
№ 11 (52)
СУБОТА 14 ЛІСТАПАДА 1970 года

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Цана 2 кап.

**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

Калектыў універсітэта ўрачыста адзначыў 53-ю гадавіну Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі — 1-я стар.

Да 150-годдзя з дня нараджэння Ф. Энгельса — 2—3-я стар.

Трыбуна куратара — 2-я стар.

Гордае імя — стаханавец. Да 35-годдзя з дня адкрыцця Усесаюзнай нарады стаханаўцаў — 2-я стар.

У барацьбе за мір і шчасце. Да Міжнароднага дня студэнтаў — 3-я стар.

Спорт, весткі з практыкі — 4-я стар.

# СЦЯГІ ЧЫРВОНЫЯ ЛУНАЮЦЬ НАД КАЛОНАМІ

## КАЛЕКТЫЎ УНІВЕРСІТЭТА РАЗАМ З УСІМ САВЕЦКІМ НАРОДАМ УРАЧЫСТА АДЗНАЧЫЎ 53-ю ГАДАВІНУ ВЯЛІКАГА КАСТРЫЧНІКА



Кастрычнік! У чырвані сцягоў і транспарантаў прыйшло свята на нашу зямлю. Сёлета падрыхтоўка да 53-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі праходзіла пад знакам магутнага руху, выкліканага хвалюючай весткай аб скліканні чарговага XXIV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза.

Кастрычнік 1917 года — першая і галоўная вяха ў жыцці нашых людзей, якія самааддана працавалі над выкананнем заданняў апошняга года пяцігодкі, над ажыццяўленнем грандыёзных і велічных задач камуністычнага будаўніцтва. Напярэдадні свята рапартавалі Радзіме аб сваіх перамогах і дасягненнях рабочыя і калгаснікі, вучоныя і студэнты — усе савецкія людзі.

Гэта аб іх працы, аб іх здабытках гаварыў у сваім дакладзе сакратар ЦК КПСС М. А. Суслаў на ўрачыстым пасяджэнні Массавета і Маскоўскага гарадскога камітэта партыі.

З думкамі аб Радзіме, аб роднай Камуністычнай партыі збіраліся лістападаўскай раніцай прафесарска-выкладчыцкі састаў і студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, каб прыняць удзел у святочным шэсці працоўных. Марозна. З-за рэдкіх хмар выглядае сонейка. Здаецца, і яно сёння раздзяляе нашу радасць.

Яшчэ не было і васьмі гадзін, а ў вестыбюлі ўжо збіраюцца студэнты і выкладчыкі факультэта фізічнага выхавання. Гэта і зразумела — менавіта ім прадстаіць масавымі паказальнымі выступленнямі прадэманстраваць дасягненні універсітэта ў спартыўна-масавай рабоце. Ідуць апошнія ўдакладненні. Хвалююцца гімнасты, фехтавальшчыкі, баскетбалісты, прадстаўнікі іншых відаў спорту.

Да дзесяці гадзін зборы былі закончаны. Трохтысячная калона Гомельскага дзяржаўнага універсітэта рушыла ў напрамку да месца традыцыйных урачыстых шэсцяў і маніфестацый — плошчы імя Уладзіміра Ільіча Леніна.

Уперадзе калоны — сцяг ГДУ. Самаму дастойнаму давяраецца такі высокі гонар — несці сцяг калектыву. На гэты раз ён быў у руках праслаўленага савецкага спартсмена, чэмпіёна свету і Рымскай алімпіяды, выкладчыка факультэта фізічнага выхавання Леаніда Рыгоравіча Гейштара. Ды і асістэнты ў сцяганосца дастойныя — ленінскі стыпендыят, будучы біёлаг Тамара Ільянкова і студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта, выдатніца вучобы Надзея Шабан.

Бурліць святочны старажытны Гомель. З песнямі рухаюцца калоны, і, нібы рачулкі-працаўніцы, зліваюцца ў адзіны магутны паток на праспекце, які носіць імя дарагога правадыра. Аб сваіх працоўных здабытках рапартуюць камбайнабудаўнікі «Гомсельмаша» і кандытары камбіната «Спартак», швейнікі «Камінтэрна» і абутнікі «Працы». Працоўны Гомель дакладвае Радзіме аб сваіх здзяйсненнях і планах на будучае.

Калоны дэманстрантаў уліваюцца на плошчу. З краю ў край нясуцца здравіцы сацыялістычнай Айчыне, яе авангарду — Камуністычнай партыі. Кіраўнікі абласных партыйных і савецкіх арганізацый, госці Гомеля цёпла вітаюць людзей навукі, савецкае студэнцтва, апладыруюць юнацтву нашага горада.

З высокімі паказчыкамі ў вучобе і працы сустрэў наш калектыў 53-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка: выраслі рады выдатнікаў вучобы, многімі добрымі справамі зарэкамендавалі сябе на будоўлях Гомельшчыны пасланцы ГДУ. Аб гэтым яны рапартавалі Радзіме ў дзень свята.

Наша неабсяжная краіна рыхтуецца да знамянальнай падзеі ў сваім жыцці — XXIV з'езда КПСС. Разам з усім народам дастойна сустракаюць форум камуністаў і прадстаўнікі навукі. Аб сваіх рубяжах да гэтай сапраўды гістарычнай падзеі паведамлялі яны на ўрачыстай дэманстрацыі, якая яшчэ раз стала пераканаўчым сведчаннем адданасці савецкіх людзей сваёй Радзіме, іх згуртаванасці вакол выпрабаванага правадыра — Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, якая цвёрда і ўпэўнена ідзе па ленінскаму шляху.

**На здымках: уверсе — калона Гомельскага дзяржаўнага універсітэта праходзіць па плошчы імя У. І. Леніна.**

**Злева — у калоне дэманстрантаў.**

**Унізе — паказальныя выступленні гімнастаў універсітэта.**

**Наш кар.**





